Кобрынская раённая цэнтралізаваная
бібліятэчная сістэма
Цэнтральная раённая бібліятэка
Аддзел абслугоўвання і інфармацыі

# Малой радзімы частка біяграфіі

*Інфармацыйна-бібліяграфічны нарыс
да 80-годдзя з часу ўтварэння Кобрынскага раёна
як адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі ў
Брэсцкай вобласці*

Кобрын
2020

ББК 91.9:26.89 (4Беи)

М19

**Складальнік:**

***С. Д. Курачук*** – галоўны бібліёграф аддзела абслугоўвання і інфармацыі цэнтральнай раённай бібліятэкі дзяржаўнай установы культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»

М19 **Малой радзімы частка біяграфіі** : інфармацыйна-бібліяграфічны нарыс да 80-годдзя з часу ўтварэння Кобрынскага раёна як адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі ў Брэсцкай вобласці / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. Святлана Курачук. – Кобрын : Цэнтральная раённая бібліятэка, 2020. - 40 с.

ББК 91.9:26.89 (4Беи)

© Афармленне Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка, 2020

# 1940-2020 гг.

## 80 гадоў з часу ўтварэння КОБРЫНСКАГА РАЁНА як адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі ў Брэсцкай вобласці



**КОБРЫНСКІ РАЁН - адміністрацыйная адзінка ў складзе Брэсцкай вобласці.**

**КОБРЫНСКІ РАЁН - адзін з найбуйнейшых рэгіёнаў не толькі ў вобласці, але і ў рэспубліцы.**

**15 студзеня 1940 года – дата, ад якой КОБРЫНСКІ РАЁН вядзе свой адлік як адміністрацыйная адзінка.**

**РАЁННЫ ЦЭНТР - горад Кобрын.**

**ПАДЗЕЛЕНЫ на 11 сельскіх саветаў.**

# Кобрынскі раён:
# *факты, падзеі, людзі*

## *Геаграфічнае становішча*

Кобрынскі раён размешчаны ў паўднёва-заходняй частцы Брэсцкай вобласці. Мяжуе з раёнамі Брэсцкай вобласці - Бярозаўскім, Драгічынскім, Жабінкаўскім, Камянецкім, Маларыцкім і Пружанскім, з Валынскай вобласцю Украіны, Тэрыторыя раёна - дзве тысячы квадратных кіламетраў (6,6 % ад агульнай плошчы вобласці). Працягласць з поўдня на поўнач - 61 кіламетр, з захаду на ўсход - 51.

## *Рэльеф*

Пераважная частка тэрыторыі раёна занята Брэсцкім Палессем. Па рэльефу паўночная частка раёна выразна адрозніваецца ад паўднёвай. На поўначы пераважаюць раўнінна-ўзгорыстыя ландшафты, гэта зона Кобрынскага Перадпалесся. Паўднёвая частка адносіцца непасрэдна да Палесся, рэльеф якога ўяўляе сабой злёгку хвалістую, амаль плоскую раўніну. Паверхня раўнінная, значна забалочаная. 90% яе размешчана на вышынях 145-150 м. Самая высокая кропка раёна (169,1 м) знаходзіцца ў 2 км ад вёскі Тэўлі, самая нізкая (138 м) – урэз вады ракі Мухавец на заходняй мяжы раёна.

## *Глеба*

У Кобрынскім раёне вылучаюцца наступныя асноўныя глебы: дзярнова-падзолістыя супяшчаныя, пяшчаныя, рэдка суглінкавыя; дзярнова-падзоліста-глеевые і глееватые супяшчаныя і пяшчаныя; тарфяніста- і тарфяна-глеевые нізіннага тыпу і тарфяна-балотныя вярхоўнага тыпу; дзярновыя; дзярнова-карбанатныя і інш.

## *Кліматычныя ўмовы*

Цёплы перыяд доўжыцца 256 дзён, працягласць халоднага перыяду складае 109-110 дзён. Самы цёплы месяц - ліпень, самы халодны – студзень. Сярэднямесячная тэмпература паветра ў ліпені вагаецца ў межах плюс 18-19°, у студзені - мінус 3,5°-5°. На працягу года на тэрыторыі раёна пануюць заходнія вятры. У цёплы перыяд пераважнымі вятрамі з'яўляюцца паўночна-заходнія, паўднёва-заходнія і заходнія.

У Кобрынскім раёне ў сярэднім выпадае 541 мм ападкаў у год. Асноўная іх колькасць даводзіцца на цёплы перыяд. Клімат раёна ў цэлым спрыяе атрыманню высокіх і ўстойлівых ураджаяў сельскагаспадарчых культур.

## *Гідраграфія*

Раён налічвае 18 вялікіх і малых рэчак, агульная даўжыня якіх складае 298 км. Рачная сетка належыць да басейна Заходняга Буга. З рэк, што працякаюць па тэрыторыі Кобрынскага раёна, найбольшая - Мухавец. У межах раёна - Дняпроўска-Бугскі і Арэхаўскі каналы. Найбольшае возера - Любань. Балотамі занята 7% плошчы, найбольшыя балотныя масівы - Вялікі Лес, Ёлка.

*Рэкі*: Мухавец, Выдзерка, Дахлаўка, Кобрынка, Літкова, Трасцяніца, Шемятоўка, Шопс, Шэўня.

*Азёры*: Любань, Свінарэйка, Бамаўскае (узнікла ў выніку будаўніцтва аўтамабільнай трасы Брэст – Мінск), Каташы.

*Каналы*: Дняпроўска-Бугскі канал, канал Бона, Казацкі канал.

*Вадасховішча:* Днепра-Бугскае, Арэхаўскае.

## *Карысныя выкапні*

торф (39 радовішчаў, у тым ліку Польскае, Ёлка, Вялікі лес і інш. агульнай плошчай 66.3 га.);

буры вугаль (радовішчы: раёны вёсак Быстрыца, Лепясы, Луцэвічы, Падбер’е);

гліна (7 радовішчаў: Падзяменскае, Імянінскае, Пескаўскае, Худлінскае, Вялікае Лепясоўское і інш.), агульныя запасы - 26553 куб. м.;

пясок будаўнічы (6 радовішчаў: Бабіна гара, Крывая гара, Нестрыбуша, Тэўлі II, Турна, Зімнікі);

сапрапелі (найбуйнейшае радовішча ў раёне – Вялікалескае (запасы - 108.8 млн. куб.м);

фасфарыты (радовішчы - наваколлі вёсак Лелікава, Дзівін);

бурштын (радовішчы - раёны вёсак Каташы, Хідры, балоты Вялікі Лес).

## *Біярэсурсы*

Лясістасць тэрыторыі – 25,9%. Лесам пакрыта 20027 га. Агульная плошча зялёных насаджэнняў у г. Кобрыне - 273.5 га. Лясы - хваёвыя, бярозавыя, чорна-альховыя, дубовыя і яловыя масівы. Шырока распаўсюджаны прадстаўнікі драўняных парод, такіх, як хвоя, бяроза, ёлка, алешына, дуб, граб, ляшчына, вярба, ясень, вяз.

Сустракаюцца шматлікія прадстаўнікі жывёльнага свету, сярод іх: заяц-бяляк, лось, кабан, барсук, вавёрка, янотападобны сабака, бабёр, андатра, лебедзь-шыпун, качка-нырэц, цецярук, жаўрук, дзяцел і іншыя.

У Кобрыне сустракаецца экзатычная, рэдкая для Беларусі расліна, якое атрымала статут асоба ахоўных помнікаў прыроды, - гінкго двулопасны (ГИНКГО (Ginkgo), вярба серабрыстая vitellina.

## *Гісторыя*

Пасля ўтварэння ў канцы 1939 года новых абласцей і раёнаў, якія замянілі ранейшы адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел, Кобрын стаў цэнтрам раёна Брэсцкай вобласці.

***15 студзеня 1940 года*** – дата, ад якой Кобрынскі раён вядзе свой адлік як адміністрацыйная адзінка. Гэтым днём

датаваны Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР «Аб стварэнні раёнаў у Баранавіцкай, Беластоцкай, Брэсцкай, Вілейскай і Пінскай абласцях Беларускай ССР». У Брэсцкай вобласці сярод іншых былі створаны Антопальскі, Дзівінскі і Кобрынскі раёны, у склад якіх увайшла тэрыторыя сучаснага Кобрынскага раёна.

Кобрынскі раён уключаў былыя Падалескую (цалкам), Кобрынскую, Тэвельскую і Навасёлкаўскую (часткі) воласці. Тэрыторыя раёна першапачаткова склала 837 км$^2$ (733,32 км$^2$ на 23.06.1940), насельніцтва - 40311 чалавек (1939), з якіх беларусаў - 21641, рускіх - 5600, украінцаў - 5000, палякаў - 1720, яўрэяў - 5950.

Да чэрвеня 1940 года былі арганізаваны два калгасы: імя Варашылава – у былым маёнтку Паляцічы і імя Сталіна – у вёсцы Пескі.

На 23.06.1940 года ў раёне было 225 населеных пунктаў, якія налічвалі 7536 сялянскіх гаспадарак, у т. л. 3370 хутарскіх, 50985 жыхароў.

Дзівінскі раён быў створаны на месцы былых Дзівінскай, часткі Лелікаўскай і Навасёлкаўскай валасцей. У чэрвені 1940 года тэрыторыя раёна склала 1008 км$^2$, у т. л. 15139 га ворыва, 27677 га сенажаці, 44403 га пашы, 7995 га лесу, 8286 га няўдобіцы. Максімальная адлегласць паміж межамі раёна з поўначы на поўдзень складала 27 км, з захаду на ўсход - 67 км. Раён налічваў 138 населеных пунктаў, 5460 двароў (2106 хутарскіх двароў).

12 кастрычніка 1940 года Кобрынскі раён падзелены на 13 сельсаветаў: Батчынскі, Жухавецкі, Закросніцкі, Засімаўскі, Казішчанскі, Кіселявецкі, Краснапескаўскі, Лепясоўскі, Пескаўскі, Стрыгаўскі, Тэвельскі, Хідрынскі, Яроміцкі.

У Кобрынскім раёне ў 1940 годзе працавалі 13 хат-чытальняў, 59 школ, з якіх восем – няпоўныя сярэднія (6 беларускіх, 1 руская, 1 яўрэйская), 50 – пачатковыя (35 беларускіх, 11 украінскіх, 1 польская); у вёсцы Плянта дзейнічала школа трактарыстаў міжраённага значэння.

22 чэрвеня 1941 года пачалася Вялікая Айчынная вайна. У першыя гадзіны вайны ў паветраны бой уступілі лётчыкі 123-га знішчальнага авіяцыйнага палка, які стаяў у Кобрыне. Раён быў акупіраваны фашыстамі. Жорсткія баі, гераізм, мужнасць характарызуюць усю гісторыю кобрынскай зямлі перыяду Вялікай Айчыннай.

23 чэрвеня 1941 года 22-я танкавая дывізія на чале з генерал-маёрам В. П. Пуганавым і воінамі 6-й і 42-й стралковых дывізій трымалі абарону ў 12-15 км паўночна-заходней і ўсходней Кобрына. У памяць пра гэтыя падзеі да 60-годдзя вызвалення Кобрыншчыны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, на месцы першых танкавых баёў Вялікай Айчыннай вайны, у 2004 годзе закладзены сквер імя Герояў-танкістаў і ўсталяваны танк Т-44.



Вялікі ўклад у разгром фашызму ўнёс Кобрынскі раён. Наш край стаў адным з першых партызанскіх і падпольных цэнтраў. У ліпені-жніўні 1941 года ў вёсцы Турная сфарміраваны антыфашысцкі падпольны камітэт на чале з Д. Барысюком, 23 лістапада 1943 года ўтвораны Кобрынскі падпольны райкам КП(б)Б. Барацьбу з акупантамі вялі партызанскія атрады брыгады імя Чапаева, асобныя партызанскія атрады імя Катоўскага, Чарнака, Кірава, Шчорса, Фрунзе; разведвальна-дыверсійная група атрада імя Суворава, разведатрад Чырвонай Арміі.

За перыяд акупацыі агульная колькасць расстраляных, закатаваных і спаленых кабрынчан склала каля 13 тысяч чалавек, у тым ліку каля 2000 дзяцей.

Раён вызвалены 20 ліпеня 1944 года войскамі Першага Беларускага фронту ў ходзе Люблін-Брэсцкай аперацыі.



У 1948-1949 гадах у раёне паўсюдна арганізоўваюцца калгасы.

16 ліпеня 1954 года скасаваны Жухавецкі, Засімаўскі, Красналескаўскі, Пескаўскі, Хідрынскі сельсаветы, утвораны Астроміцкі, Пецькаўскі сельсаветы, Закросніцкі сельсавет перайменаваны ў Залескі, вёска Млынок перададзена ў Пружанскі раён.

У 1959-1962 гадах адбываюцца тэрытарыяльныя змены і ўзбуйненні Кобрынскага раёна.

8 жніўня 1959 года да Кобрынскага раёна далучаны Аніскавіцкі, Гарадзецкі, Грушаўскі сельсаветы скасаванага Антопальскага раёна, Верхалескі, Дзівінскі, Навасёлкаўскі, Павіццеўскі, Хабовіцкі сельсаветы скасаванага Дзівінскага раёна, Азяцкі і Рагазнянскі сельсаветы скасаванага Жабінкаўскага раёна. 11 жніўня 1959 года скасаваны Казішчанскі і Стрыгаўскі сельсаветы, у склад раёна з Драгічынскага раёна перададзены населеныя пункты Бярэзна, Іласк, Калонія, Лука, Навасёлкі, Смалярня і Шамятоўка. 30 кастрычніка 1959 года скасаваны Верхалескі, Лепясоўскі і Хабовіцкі сельсаветы.

14 красавіка 1960 года да раёна далучаны Стрыганецкі сельсавет Брэсцкага раёна (ліквідаваны 21.01.2001 года, тэрыторыя была ўз'яднана з Рагазнянскім сельсаветам).

21 студзеня 1961 года скасаваны Грушаўскі і Стрыганецкі сельсаветы.

25 снежня 1962 года да раёна далучаны гарадскі пасёлак Жабінка, Крыўлянскі, Сакскі, Сцяпанкаўскі і Якаўчыцкі

сельсаветы Камянецкага раёна, Осаўскі і Чарнянскі сельсаветы скасаванага Маларыцкага раёна.

4 студзеня 1965 года гарадскі пасёлак Жабінка, Сакскі і Сцяпанкаўскі сельсаветы перададзены ў склад Брэсцкага раёна. 6 студзеня 1965 года Чарнянскі сельсавет перададзены зноў утворанаму Маларыцкаму раёну.

30 ліпеня 1966 года Азяцкі, Крыўлянскі, Рагозненскі і Якаўчыцкі сельсаветы перададзены зноў утворанаму Жабінкаўскаму раёну.

18 снежня 1972 года Пецькаўскі сельсавет перайменаваны ў Хідрынскі, 19 ліпеня 1976 года - Яроміцкі сельсавет у Буховіцкі.

Адміністрацыйна з 1962 года Кобрынскі раён падзяляецца на 13 сельсаветаў: Аніскавіцкі, Астроміцкі, Батчынскі, Буховіцкі, Гарадзецкі, Дзівінскі, Залескі, Кісялевіцкі, Навасёлкаўскі, Осаўскі, Павіццеўскі, Тэвельскі, Хідрынскі.

У сучасных межах Кобрынскі раён знаходзіцца з 25 снежня 1967 года.

У 60-х гадах ХХ стагоддзя праходзіць масавая меліярацыя зямель і электрафікацыя вёсак, у 70-х – газіфікацыя. У 80-я гады Кобрынскі раён займае трэцяе месца па добраўпарадкаванні населеных пунктаў у Савецкім Саюзе. На карце раёна з’явіўся новы пасёлак Днепра-Бугскі.

Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 6 ад 04.01.2002 Кобрынскі раён і горад Кобрын былі аб'яднаны ў адну адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінку – Кобрынскі раён з адміністрацыйным цэнтрам г. Кобрын.



Дата 22 ліпеня 2004 года ўвайшла ў гісторыю Кобрыншчыны важнай вехай. Герб і флаг раёна былі зацверджаны Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 22.07.2004 года № 340 «Аб заснаванні афіцыйных

геральдычных сімвалаў Кобрынскага раёна». Гэты герб не толькі зацверджаны Геральдычным саветам пры Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, але і ўхвалены мітрапалітам Філарэтам. Цяпер Кобрын з'яўляецца другім пасля Мінска ў краіне горадам, у гербавай сімволіцы якога мы бачым лікі святых, што як бы абавязвае жыхароў да пэўнай добрачыннай адказнасці.

У 2009 годзе Кобрын прыняў «эстафетную палачку» правядзення рэспубліканскага фестывалю-кірмашу працаўнікоў вёскі «Дажынкі». Масштабна праводзіліся мерапрыемствы па рэканструкцыі і будаўніцтву аб'ектаў сацыяльнага прызначэння, камуніфікацый, дарог.




У маі 2012 года быў ліквідаваны Аніскавіцкі сельскі савет, і вёскі былога Аніскавіцкага с/с увайшлі ў склад Гарадзецкага с/с.

У чэрвені 2013 года ліквідаваны Осаўскі сельскі савет, населеныя пункты якога ўвайшлі ў Дзівінскі с/с.

На сённяшні час у раёне - 162 населеных пунктаў, 11 сельсаветаў: Астроміцкі, Батчынскі, Буховіцкі, Гарадзецкі, Дзівінскі, Залескі, Кісялевіцкі, Навасёлкаўскі, Павіццеўскі, Тэвельскі, Хідрынскі.

У 2020 годзе ў аграгарадку Дзівін запланавана знакавае мерапрыемства – абласны фестываль-кірмаш працаўнікоў вёскі «Дажынкі», і ўжо вядуцца работы па яго падрыхтоўцы.

За апошнія гады раён стаў камфортным і ўтульным для жыцця людзей. Кобрынская зямля прыгожая, з добрым кліматам і прыветлівымі людзьмі, багатая гістарычнымі месцамі і цудоўнымі куточкамі для адпачынку. Нам ёсць чым ганарыцца, каго памятаць і шанаваць.

Гісторыя працягваецца…

## *Насельніцтва раёна*

По дадзеных на 1 студзеня 2019 года ў Кобрынскім раёне налічваецца 84625 чалавек, гарадское насельніцтва складае – 53411, сельскае – 31214. Насельніцтва прадстаўляюць больш 50 нацыянальнасцей.

## *Эканамічны патэнцыял раёна*

Эканамічны патэнцыял раёна прадстаўлены 16 прамысловымі прадпрыемствамі (на 01.10.2019). Структура прамысловасці па галінах: харчовая – 53,6%, вытворчасць пластмасавых цацак – 20,2%, машынабудаванне – 8,9%, лёгкая – 4,8%, вытворчасць і размеркаванне электраэнергіі, вады – 4,5%, дрэваапрацоўка – 0,3%, іншыя –7,7%. Тавары з кобрынскай маркай добра вядомы не толькі ва ўсіх рэгіёнах Беларусі, але і ў краінах блізкага і далёкага замежжа. На сучасным этапе дзевяць прамысловых арганізацый раёна ажыццяўляюць выпуск інавацыйнай прадукцыі. Сёння Кобрыншчына - адзін з лідараў у сферы экспарту тавараў не толькі ў вобласці, але і ў краіне. Раён экспартуе сваю прадукцыю ў 60 краін свету, новае аблічча набываюць прадпрыемствы Кобрыншчыны, развіваецца малы і сярэдні бізнес. У 2019 годзе Кобрыншчына заняла трэцяе месца ў Брэсцкай вобласці па аб’ёме экспарту тавараў, па тэмпах росту экспарту тавараў – сёмая пазіцыя.

Эканоміку раёна вызначаюць суб’екты малога і сярэдняга прадпрымальніцтва (МСП). У Кобрынскім раёне ажыццяўляюць дзейнасць каля сямісот юрыдычных асоб - суб'ектаў МСП і больш 2 тысяч індывідуальных прадпрымальнікаў (ІП). За 9 месяцаў 2019 года зарэгістравана ў раёне 25 камерцыйных арганізацый, у тым ліку 7 у сферы вытворчасці, 7 у гандлі, 4 у сельскай гаспадарцы, 7 у сферы іншых паслуг. Зарэгістравана 237 ІП, у тым ліку: 69 у гандлі, 45 у будаўніцтве, 34 у транспартнай дзейнасці.

## Сельская гаспадарка

Вядучая роля ў эканоміцы Кобрыншчыны належыць сельскай гаспадарцы. Раён спецыялізуецца на вытворчасці мяса, малака, збожжа, кармавых культур, цукровага бурака, рапсу. Але асновай аграрнай эканомікі з'яўляецца жывёлагадоўля, якая дае каля 70 працэнтаў таварнай прадукцыі. У склад аграпрамысловага комплексу раёна ўваходзяць 19 сельскагаспадарчых прадпрыемстваў: 1 сельскагаспадарчы вытворчы кааператыў, 13 адкрытых акцыянерных таварыстваў, камунальнае сельскагаспадарчае ўнітарнае прадпрыемства «Племянны завод «Дружба», сельскагаспадарчае ўнітарнае прадпрыемства «Сяльгас-Павіцце», замежнае таварыства з абмежаванай адказнасцю «Бісоло ГабрыэлеФарм», таварыства з абмежаванай адказнасцю «КантрыМілк», дзяржаўная сортавыпрабавальная ўстанова. У раёне зарэгістраваны 81 сялянска-фермерская гаспадарка. За імі замацаваны больш 3,7 тыс. га зямлі. Сярэдняспісавая колькасць працаўнікоў сельскагаспадарчых арганізацый складае 3402 чал. За 2019 год тэмп росту валавай прадукцыі сельскай гаспадаркі раёна склаў 97,8 %.

## Транспарт

Па тэрыторыі раёна праходзяць дзве лініі Беларускай чыгункі з захаду на ўсход і з захаду на паўночны ўсход. Раён перасякаюць аўтамабільныя дарогі Мінскага, Гомельскага, Гродзенскага, Брэсцкага і Ковельскага напрамкаў. Па Дняпроўска-Бугскім канале і рацэ Мухавец адбываецца суднаходства. На Кобрыншчыне знаходзяцца нафтаправод «Дружба» і 3 ніткі газаправода.

## Рэлігія

У Кобрынскім раёне дзейнічаюць 63 зарэгістраваныя рэлігійныя абшчыны і 2 рэлігійныя арганізацыі (праваслаўны жаночы манастыр і аб'яднанне ЕХБ).

## *Турыстычны патэнцыял*

Кобрынскі раён – прывабны турыстычны цэнтр Брэстчыны. Помнікі гісторыі і культуры - сваеасаблівы летапіс жыцця народа. Яны даюць магчымасць глыбей асэнсаваць сучаснасць і вызначыць шлях у будучае. У Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь па Кобрынскаму раёну занесена 72 гісторыка-культурныя каштоўнасці, у тым ліку 69 матэрыяльных нерухомых, 1 матэрыяльная рухомая, 2 нематэрыяльныя. Трэба адзначыць, што амаль 30% ад усіх гісторыка-культурных каштоўнасцей Брэсцкай вобласці знаходзіцца ў Кобрынскім раёне. Шматлікія каштоўнасці знаходзяцца на мясцовым уліку. Створаны заказнікі мясцовага значэння: Клішча, Мелянкова, Дзівін - Вялікі Лес, геалагічны - тарфяны заказнік Ёлка. У раёне актыўна працуюць аграсядзібы.

## *Вядомыя асобы*

Безумоўна, галоўнае багацце нашага раёна - гэта людзі - добрыя, працалюбівыя, таленавітыя. Кабрынчан заўсёды вылучала самаадданая любоў да роднай зямлі.

Нашы славутыя землякі:



***Антанюк Максім Антонавіч*** *(1895–1961)*- савецкі ваенны дзеяч, генерал-лейтэнант, ураджэнец в. Мацы;



***Дзямчук Міхаіл Іванавіч*** *(1946-2016)* - вядомы дзяржаўны грамадскі дзеяч, член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь, беларускі вучоны, ураджэнец в. Дзявяткі;



***Зарыскі Оскар*** *(1899–1986)* - амерыканскі матэматык, адзін з найбольш вядомых алгебраічных геометраў XX стагоддзя, ураджэнец г. Кобрына;



***Іаўчук Міхаіл Трыфанавіч*** *(1908-1990)* - філосаф, прафесар, доктар філасофскіх навук, член-карэспандэнт АН СССР, замежны член Балгарскай АН, ураджэнец в. Завужоўе;



***Іўчанкаў Віктар Іванавіч*** *(1962)* - доктар філалагічных навук, прафесар, лінгвіст, педагог, журналіст, ураджэнец в. Хадынічы;



***Качурка Васілій Іванавіч*** *(1950)* - беларускі навуковец у вобласці сельскай гаспадаркі, доктар сельскагаспадарчых навук, прафесар, ураджэнец в.Стрыі;



***Кірмановіч Уладзімір Мікалаевіч*** *(1919-2001)* – Герой Савецкага Саюза, Ганаровы грамадзянін горада Кобрына, ураджэнец г. Кобрына;



***Кузьміч Мікалай Пятровіч** (1950)* - беларускі мастак, ювелір, Ганаровы грамадзянін горада Брэста, Заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь, ураджэнец в. Патрыкі;



***Мартынаў Аляксей Міхайлавіч** (1904-1999)* – краязнаўца, гісторык, публіцыст, грамадскі дзеяч, Ганаровага грамадзянін горада Кобрына, ураджэнец г. Кобрына;



***Панасюк Іван Паўлавіч** (1960)* – грамадскі дзеяч, старшыня праўлення беларускага культурна-асветніцкага цэнтра ў гонар святой Еўфрасінні Полацкай, кандыдат філасофскіх навук, ураджэнец в. Лелікава;



***Рагоўскі Яўген Аляксандравіч** (1855-1923)* - фізік і метэаролаг, прафесар Пецярбургскага і Харкаўскага ўніверсітэтаў, ураджэнец г. Кобрына;



***Свідуновіч Мікалай Аляксандравіч** (1940)* - доктар тэхнічных навук, прафесар, акадэмік Міжнароднай акадэміі навук Еўразіі, ураджэнец в. Дзівін;



***Семянюк Уладзімір Андрэевіч** (1940-2018)* - беларускі філосаф, палітолаг, доктар філасофскіх навук, прафесар, ураджэнец в. Залессе;



***Сінчук Іван Іванавіч** (1956)* - гісторык, археолаг і нумізмат, аўтар навуковых прац па нумізматыцы і археалогіі, ураджэнец г. Кобрына;



**Фалькоўскі Дзмітрый Нікіфаравіч** (1898-1934) - палескі паэт, перакладчык, ураджэнец в. Вялікія Лепясы;



***Чарота Іван Аляксеевіч** (1952)* – вядомы беларускі літаратуразнавец, крытык, перакладчык, доктар філалагічных навук, прафесар, акадэмік Сербскай Акадэміі навук і мастацтваў, акадэмік Міжнароднай Славянскай Акадэміі навук, адукацыі, мастацтва і культуры, ураджэнец в. Лышчыкі;



***Энгельгардт Васілій Паўлавіч** (1828–1915)* - астраном і мецэнат, член-карэспандэнт Пецярбургскай АН (1890), доктар астраноміі, ураджэнец в. Кустовічы.

Жыццё горада і раёна асвятляецца

раённай газетай «Кобрынскі веснік»,

штотыднёвай рэгіянальнай газетай г. Кобрына «Кобрин-информ»,

на электроннай старонцы «Кобрынскі райвыканкам» сайта Брэсцкага аблвыканкама,




на электронным навінавым партале горада Кобрына (Kobrin City.by)

# КОБРЫНСКІ РАЁН
## *хроніка гісторыі ў датах*




**Датай афіцыйнага юбілею – 80-годдзя з дня заснавання Кобрынскага раёна ў складзе Брэсцкай вобласці – з'яўляецца 15 студзеня 1940 года. Але, безумоўна, гісторыя станаўлення раёна, гісторыя развіцця матэрыяльнай і духоўнай культуры Кобрыншчыны, непарыўна звязаная з гісторыяй усёй нашай краіны, пачынаецца значна раней, у бязмернай глыбіні стагоддзяў…**

## *З глыбіні стагоддзяў да нашых дзён*

### *14 тыс. гадоў да н.э.*

З'яўленне першых людзей на тэрыторыі сучаснай Кобрыншчыны.

### *2 тыс. гадоў да н.э.*

Існаванне на тэрыторыі Кобрыншчыны адной з груп плямён, што адносіліся да культуры шнуравой керамікі.

## VII ст. н.э.

На тэрыторыі Кобрыншчыны рассяляецца славянскае племя дулебаў.

## Канец X ст.

Заходнепалескія землі, у т. л. і тэрыторыя Кобрыншчыны, у складзе Старажытнарускай дзяржавы з цэнтрам у Кіеве.

## 1142 год

Першае ўпамінанне пра Гарадзец.

## Канец XII ст.

Утвараецца Галіцка-Валынскае княства, у якое ўваходзяць і землі Кобрыншчыны.

## 1287 год

Першае пісьмовае ўпамінанне пра Кобрын.

## 1366 год

Польскі кароль Казімір III Вялікі пацвярджае правa вялікага князя літоўскага Альгерда на Кобрын з паветам.

## 1387 год

Князь Раман Фёдаравіч (з Альгердавічаў) — уладальнік Кобрына. Пачатак існавання Кобрынскага княства.

## 1431 год

Бой дружыны кобрынскага князя Сямёна Раманавіча з атрадам каралеўскага ваяводы.

## *1519 год*

Канец дынастыі князёў Кобрынскіх. Кобрын з прылеглымі землямі становіцца каралеўскім уладаннем — староствам. Першы староста — Вацлаў Касцевіч.

## *1520—1566 гг.*

Кобрынскі павет уваходзіць у склад Падляшскага ваяводства Вялікага княства Літоўскага.

## *1540 год*

Па тэрыторыі Кобрыншчыны пракладзены канал каралевы Боны — першы вядомы на Беларусі меліярацыйны аб'ект.

## *1563 год*

Каралеўскі рэвізор Д. Сапега зрабіў першую вядомую рэвізію Кобрынскай эканоміі.

## *1566 год*

Кобрынскі павет увайшоў у склад Берасцейскага ваяводства Рэчы Паспалітай.

## *1589 год*

Кобрын атрымлівае Магдэбургскае права (самакіраванне).

## *1626 год*

У Кобрыне праходзіць сабор уніяцкага вышэйшага і сярэдняга кліру на чале з мітрапалітам І. Руцкім.

## *1706 год*

Войскі шведскага караля Карла XII пад час Паўночнай вайны 1700-1721 гг. захапілі і разрабавалі Кобрын.

## *1711 год*

Эпідэмія знішчыла больш за палову жыхароў Кобрына. Пачатак эканамічнага заняпаду горада.

## *1757 год*

Літоўскі падскарбі Ежы Флемінг спрабуе рэфармаваць гаспадарчую дзейнасць Кобрынскай эканоміі, аб'яднаўшы яе з Брэсцкай, а сёлы і войтаўствы зводзячы ў ключы. Утварэнне Кобрынскага ключа.

## *1766 год*

Кобрын пазбаўляецца права на самакіраванне.

## *1768 год*

Літоўскі падскарбі і дзяржаўца Брэсцка-Літоўскай эканоміі Антоній Тызенгаўз спрабуе рэфармаваць эканомію. Для яе адміністрацыі будуецца новая сядзіба, за якой надоўга замацавалася назва «Губерня». Вакол сядзібы разбіваецца парк (сучасны парк імя А. В. Суворава).

## *1784 год*

### *Жнівень*

Апошні кароль Рэчы Паспалітай Станіслаў Аўгуст Панятоўскі наведвае Кобрын і Гарадзец пад час адкрыцця Каралеўскага канала.

## *1794 год*

*Верасень*

У час падаўлення расійскімі войскамі паўстання пад кіраўніцтвам Тадэвуша Касцюшкі 5-тысячны атрад пад камандаваннем А. В. Суворава разграміў 14 верасня часці паўстанцаў пад Дзівінам, захапіў Кобрын, а праз тры дні пад Крупчыцамі нанёс паражэнне корпусу К. Серакоўскага.

## *1795 год*

У выніку трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай землі Кобрыншчыны адышлі да Расійскай імперыі. Кобрынскі павет увайшоў у Слонімскую губерню.

## *1797 год, 1800 год*

У Кобрыне жыў А. В. Сувораў, якому імператрыца Кацярына II падаравала маёнтак Кобрынскі Ключ.

## *1797—1801 гг.*

Кобрынскі павет у складзе Літоўскай губерні.

## *1801—1921 гг.*

Кобрынскі павет у складзе Гродзенскай губерні.

## *1812 год*

*17 верасня (па ст. ст.)*

У Кобрыне руская армія атрымала першую перамогу над напалеонаўскімі войскамі.

## *1845 год*

Кобрын атрымаў новы герб - з малюнкам зубра ў верхняй частцы шчыта, як знака губерні, прыналежнасці Кобрынскага павета да Гродзенскай губерні, і сахі, плуга ў ніжняй, як знака

горада, які сімвалізаваў асноўны занятак насельніцтва (прыхільнасць кабрынчан да агародніцтва і земляробству).

## 1846 год

Праз Кобрыншчыну пракладзена шаша Масква - Варшава, у горадзе з'явілася паштовая станцыя.

## 1863 год

На Кобрыншчыне пад час паўстання 1863-1864 гг. дзейнічаў атрад Р. Траўгута.

## 1868 год

У Кобрыне пабудаваны сабор Аляксандра Неўскага.

## 1882 год

Пачаўся рух на ўчастку чыгункі Пінск — Жабінка, якая пралягла і праз Кобрыншчыну. У Кобрыне з'явілася чыгуначная станцыя.

## 1889—1939 гг.

Творчая дзейнасць польскай пісьменніцы М. Радзевіч, якая жыла ў маёнтку Грушава на Кобрыншчыне.

## 1905—1906 гг.

Рэвалюцыйныя выступленні ў горадзе і павеце.

## 1915 год

Акупацыя Кобрына і павета ў час Першай сусветнай вайны. Многія жыхары Кобрыншчыны сталі бежанцамі.

## *1920 год*

У час савецка-польскай вайны Чырвоная армія заняла Кобрын. Уся ўлада на тэрыторыі горада і павета на працягу жніўня належала ваенна-рэвалюцыйнаму камітэту на чале з П. Я. Харашылавым.

## *1921 год*

Паводле Рыжскага мірнага дагавора Заходняя Беларусь адышла да Польшчы. Рэарганізаваны Кобрынскі павет увайшоў у склад Палескага ваяводства.

## *1933 год*

### *Жнівень*

Адбылося ўзброенае выступленне сялян у Навасёлках.

## *1939 год*

### *1 верасня*

Германія напала на Польшчу. Пачалася Другая сусветная вайна.

### *17 верасня*

На подступах да Кобрына (рубеж канала Боны) адбыўся бой з нямецкімі часцямі. Многія жыхары Кобрыншчыны ўдзельнічалі ў абарончай вайне.

### *22 верасня*

У Кобрын увайшлі савецкія часці.

### *Верасень*

Заснавана першая раённая газета «Труд» (зараз «Кобрынскі веснік»).

*28—30 кастрычніка*

Народны сход Заходняй Беларусі прыняў дэкларацыю пра ўз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР.

*12 лістапада*

Сесія Вярхоўнага Савета БССР прыняла закон пра ўз'яднанне Заходняй Беларусі і БССР.

## ***1940 год***

*15 студзеня*

Утвораны Кобрынскі раён у складзе Брэсцкай вобласці.

## ***1941 год***

*22 чэрвеня*

Пачалася Вялікая Айчынная вайна. Паветраныя баі лётчыкаў 123-га знішчальнага авіяпалка ў небе над Кобрыншчынай.

*23 чэрвеня*

Жорсткія баі пад Кобрынам вялі байцы 22-й танкавай дывізіі пад камандаваннем генерал-маёра В. П. Пуганава. Пачатак акупацыі Кобрына нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

*Ліпень — жнівень*

У в. Турная сфарміраваны антыфашысцкі падпольны камітэт на чале з Д. Барысюком.

*Жнівень — верасень*

Фарміраванне партызанскіх груп В. Бойкі, І. Арлова, А. Навумчыка.

## *1942 год*

Аб'яднанне партызанскіх груп у атрады.

## *1943 год*

### *23 лістапада*

Утвораны Кобрынскі падпольны райком КП(б)Б.

## *1944 год*

### *20 ліпеня*

Кобрын вызвалены часцямі 61-й арміі 1-га Беларускага фронту.

### *Верасень — снежань*

З верасня стала працаваць сярэдняя школа № 1, быў адкрыты дзіцячы дом для сірот, наладжана медыцынскае абслугоўванне, аднавіў работу кінатэатр «17 Верасня».

## *1945 год*

### *Май*

Пачалося суднаходства па аднаўленым Дняпроўска-Бугскім канале.

## *1948 год*

У Кобрыне ўведзены ў эксплуатацыю кансервавы завод — адзін з першых такіх заводаў на Беларусі.

## *1959 год*

У жніўні да Кобрынскага раёна далучаны Аніскавіцкі, Гарадзецкі і Грушаўскі сельсаветы скасаванага Антопальскага

раёна, Верхалескі, Дзівінскі, Навасёлкаўскі, Павіццеўскі і Хабовіцкі сельсаветы скасаванага Дзівінскага раёна.

## *1963-2002 гг.*

Кобрын меў статус горада абласнога падпарадкавання.

## *1980 год*

У Кобрыне пачала дзейнічаць прадзільна-ткацкая фабрыка — адно з буйнейшых прадпрыемстваў лёгкай прамысловасці Беларусі.

## *1987 год*

### *Верасень*

Першым вялікім сваім святкаваннем Кобрын абавязаны менавіта 1987 году, калі горад адсвяткаваў 700-гадовы юбілей. У суботу, 19 верасня на плошчы 700-годдзя Кобрына была закапана капсула з пасланнем да будучага пакалення захоўваць традыцыі сваіх продкаў і прымнажаць багацце роднай зямлі.

## *1998 год*

У Кобрыне пражывала 51,9 тыс. чалавек, у Кобрынскім раёне — 40,7 тыс.

## *2000 год*

Кобрыншчына адсвяткавала 60-годдзе раёна.

## *2002 год*

### *4 студзеня*

Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 6 ад 04.01.2002 Кобрынскі раён і горад Кобрын былі аб'яднаны як адзіная адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка.

## *2004 год*

*22 ліпеня*

Важная веха ў гісторыі Кобрыншчыны – Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 340 «Аб заснаванні афіцыйных геральдычных сімвалаў Кобрынскага раёна» зацверджаны герб і флаг раёна.

## *2009 год*

У Кобрыне прайшоў рэспубліканскі фестываль-кірмаш працаўнікоў вёскі «Дажынкі».

## *2010 год*

Кобрыншчына адсвяткавала 70-годдзе раёна.

## *2012 год*

*Май*

Ліквідаваны Аніскавіцкі сельскі савет, вёскі былога Аніскавіцкага с/с увайшлі ў склад Гарадзецкага с/с.

## *2013 год*

*Чэрвень*

Ліквідаваны Осаўскі сельскі савет, населеныя пункты якога ўвайшлі ў Дзівінскі с/с.

## *2015 год*

Кобрынскі раён адзначыў сваё 75-годдзе.

## *2017 год*

Кобрын адсвяткаваў 730-годдзе з часу першага пісьмовага згадвання.

# СПІС КРЫНІЦ

**Василёнок, М. В.** О первых социалистических преобразованиях в Кобринском районе / М. В. Василенок // В семье единой: воссоединение Западной Белоруссии в братской семье народов / М. В. Василенок. – Минск, 1977.– С. 68.

**Калинин, М. Ю.** Природные ресурсы и охрана окружающей среды Кобринского района / М. Ю. Калинин; Центральный научно-исследовательский институт комплексного использования водных ресурсов, Кобринская райинспекция природных ресурсов и охраны окружающей среды. – Минск : ООО Белсэнс, 2009. – 145 с. : ил.

**Князева, В. М.** Сацыяльна-эканамічнае становішча Кобрыншчыны ў 1939-1940 гг. / В. М. Князева // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. – С. 126-130.

**Кобринский** район // Регионы Беларуси : энциклопедия. В 7 т. Т. 1. Брестская область : в 2 кн. – Минск, 2009. – Кн. 1. – С. 476-480.

**Кобринский** район // Республика Беларусь : энциклопедия: [в 7 т]. – Минск, 2007. – Т. 4. – С. 101.

**Кобринский** район // Туристская энциклопедия Беларуси. – Минск, 2007. – С. 247-248.

**Кобринский** район // Туристские регионы Беларуси. – Минск, 2008. – С. 71-72.

**Кобринский** район // Свод памятников истории и культуры Белоруссии. Брестская область. – Минск, 1990. – С. 242-263.

**Кобринский** район // От Беловежской пущи до Полесских болот : путеводитель по Брестской области. – Минск, 2013. - С. 126-135.

**Кобринский** район : справочное издание / сост. Р. Г. Иванов, Ю. А. Борисюк. – Кобрин, 2003. – 15 с.

**Кобринский** район // Брестчина производит, предлагает, приглашаеи : каталог-справочник. – Баранович, 2004. – С. 140-154.

**Кобринский** район : справочно-информационный материал. – Брест, 1999. – 19 с. : ил.

**Кобринский** район // Социальные гарантии – сфера особой заботы Кобринского райисполкома. – Брест, 2003. – 100 с.

**Кобринскому** району – 60 лет (1940-2000): справочно-информационный материал. – Барановичи, 2000. – 11 с. : фото.

**Кобринщина:** 2003-2006. Этапы поступательного развития : информационно-методический бюллетень. – Кобрин : Отдел идеологической работы райисполкома, 2006. – 41 с.

**Кобрынскі** раён // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мінск, 1999. – Т. 8. – С. 371.

**Кобрынскі** раён // Беларуская савецкая энцыклапедыя : у 12 т. – Мінск, 1972. – Т. 6. – С. 45-46.

**Кобрынскі** раён // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя. – Мінск, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. – С. 105–199.

**Кобрынскі** раён // Рэспубліка Беларусь. Вобласці і раёны : энцыклапедычны даведнік. – Мінск, 2004. – С. 44-45.

**Кобрынскі** раён // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Брэсцкая вобласць. – Мінск, 1984. – С. 219-239.

**Кобрынскі** раён // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. – Мінск, 1997. – Т. 4. – С. 220-221.

**Кобрынскі** раён // Культура Беларусі : энцыклапедыя : [у 6 т]. – Мінск, 2012. – Т. 4. – С. 519.

**Кобрынскі** раён // Памяць Беларусі. Рэспубліканская кніга. – Мінск, 2005. – С. 118-121.

**Кобрынскі** раён // Памяць. Беларусь. Рэспубліканская кніга. – Мінск, 1995. – С. 78-83.

**Марчук, Н. Р.** Паміж памяццю і гісторыяй : малавядомыя старонкі гісторыі Кобрыншчыны : зборнік артыкулаў / Ніна Марчук. – Кобрын : Ефціфеева Н. П., 2018. – 283 с. : іл.

**Мой** родной край…: Кобринщина в открытках. – Барановичи, 2000. – 25 откр.

**Памяць.** Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск : Белта, 2002. – 624 с. : іл.

**Пліско, Н. М.** Да новага жыцця / Н. М. Пліско // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. – С. 122-123.

**По земле** Кобринской. Туристические маршруты : справочное издание / сост. Кобринский районный исполнительный комитет, отдел идеологической работы, отдел физической культуры, спорта и туризма. - Кобрин, 2004.

**Елизарова, Ж.** К скрижалям прошлого / Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. - 2019. - 23 студзеня. - С. 4 ; 30 студзеня. - С. 4 ; 6 лютага. - С. 4 ; 13 лютага. - С. 4 ; 20 лютага. - С. 6.

История создания Кобринского района.

**Кобринский** район : спецпроект «Регион» // Заря. – 2018. – 18 июля. – С. 14.

**Кобринщина** в цифрах // Кобрынскі веснік. - 2018. — 31 сакавіка. — С. 3.

**Кондрашук, Н.** Год малой родины: между памятью и историей / Наталья Кондрашук // Кобрин-информ. - 2018. — 30 августа. — С. 3.

Издан сборник статей Н. Марчук о малоизвестных страницах истории Кобринщины и Брестчины.

**Бялоў, Д.** Гаспадарскі падыход / Дзмітрый Бялоў // Кобрынскі веснік. - 2017. — 15 ліпеня. — С. 4.

Традыцыйны конкурс добраўпарадкавання прайшоў на Кобрыншчыне.

**Кобринский** район : спецпроект «Регион» // Заря. – 2017. – 21 октября. – С. 9.

**Кобринский** район : спецпроект «Регион» // Заря. – 2017. – 1 июня. – С. 14.

**Об изменении** границ сельских населенных пунктов Кобринского района : решение Кобринского районного Совета депутатов, 20 июня 2017 г., № 156 // Кобрынскі веснік. - 2017. — 2 жніўня. — С. 7.

Измененились границы сельских населенных пунктов Кобринского района: Андроново, Птицефабрика, Фруктовый, Турная, Большие Лепесы, Минянка, Островляны, Хидры.

**От метрик** до свидетельств // Кобрынскі веснік. – 2017. – 20 мая. – С. 3.

По информации отдела ЗАГС Кобринского райисполкома – данные о создании и реорганизации Кобринского района.

**Изменились** пределы пограничной полосы! // Кобрынскі веснік. - 2016. — 18 мая. — С. 6.

В Кобринском районе с 7 апреля 2016 года из пограничной зоны вышли населенные пункты Новосёлки и Бельск.

**Кобринский** район : спецпроект «Регион» // Заря. – 2016. – 10 декабря. – С. 6.

**Об изменении** границ сельских населенных пунктов Кобринского района : решение Кобринского районного Совета депутатов, 25 марта 2016 г., № 94 // Кобрынскі веснік. - 2016. — 30 красавіка. — С. 10.

Изменились границы сельских населенных пунктов Кобринского района: Гирск, Калюхи, Магдалин, Борисово, Колония, Прилуки Малые, Патрики.

**Бялоў, Д.** Зямля, якую немагчыма не любіць / Дзмітрый Бялоў // Кобрынскі веснік. – 2015. – 21 студзеня. – С. 1,2.

Кобрынскі раён адзначыў сваё 75-годдзе.

**Візітная** картка // Кобрынскі веснік. - 2015. — 15 студзеня. — С. 2.

Агульныя звесткі аб раёне.

**Гэта** наша з табой біяграфія // Кобрынскі веснік. - 2015. — 15 студзеня. — С. 3,4,5.

Хроніка гісторыі Кобрынскага раёна ў датах.

**Кондрашук, Н.** Нам не забыть свою историю / Наталья Кондрашук // Кобрин-информ. – 2015. – 22 января. – С. 2-3.

Под таким названием 16 января состоялось торжественное мероприятие, посвященное 75-летию Кобринского района.

**Мы – з Кобрыншчыны!** : Да 75-годдзя ўтварэння Кобрынскага раёна // Кобрынскі раён. – 2015. – 14 студзеня. – С. 1.

**Об изменении** границ сельских населённых пунктов Кобринского района : решение Кобринского районного Совета депутатов, 9 февраля 2015, № 50 // Кобрынскі веснік. - 2015. — 20 мая. — С. 7

**Об упразднении** Осовского сельского совета : В райисполкоме // Кобрынскі веснік. – 2013. – 15 мая. – С. 2.

**Об установлении** границ сельских населенных пунктов Кобринского района : решение Кобринского районного Совета депутатов : 30 июня 2012 г, № 124 : в ред. Закона Респ. Беларусь от 27 декабря 2012 г., № 144 // ЭТАЛОН. Законодательство Республики Беларусь / Нац. Центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2019.

**Об изменении** в административно-территориальном устройстве Жабинковского и Кобринского районов Брестской области : решение Брестского областного Совета депутатов, 11 мая 2012 г., № 198 // Заря. - 2012. - 5 июня. - С. 6.

**Об изменении** границ сельских населенных пунктов Кобринского района : решение Кобринского районного Совета депутатов, 29 декабря 2010 г., № 48 // Кобрынскі веснік. - 2011. - 9 лютага. - С. 3.

**Об изменении** границ сельских населенных пунктов Кобринского района // Кобрынскі веснік. - 2011. - 6 ліпеня. – С. 3.

Изменились границы Киселевецкого, Хидринского, Буховичского сельсоветов.

**Кобрыншчына** чакае Благадатны агонь // Кобрынскі веснік. - 2011. - 27 жніўня. - С. 1.

У рамках Дня беларускага пісьменства навукова-асветніцкая экспедыцыя пройдзе па Кобрынскаму раёну.

**Тощевикова, Т. Н**. Сколько нас, кобринчане? / Т. Н. Тощевикова // Кобрин-информ. - 2011. - 6 января. - С. 5.

В 2009 г. в Беларуси прошла перепись населения, которая показала, что численность населения Кобринщины продолжает сокращаться.

**Кордюков, А.** Кобринщина в 1944-1949: годы испытаний и энтузиазма / А. Кордюков // Кобрин-информ. - 2010. - 3 июня. - С. 6

**Мельнік, Р.** Квітней у стагоддзях, Кобрыншчына! / Раман Мельнік // Кобрынскі веснік. – 2010. - 20 студзеня. - С. 1.

Артыкул прысвечаны 70-годдзю ўтварэння Кобрынскага раёна.

**Кенда, Н.** «На пути созидания и прогресса» / Николай Кенда // Кобрынскі веснік. - 2010. - 15 студзеня. - С. 1,2,3.

Председатель райисполкома – к 70-летию образования Кобринского района.

**Белов, Д.** Преобразующая сила зодчих / Дмитрий Белов ; фото автора // Кобрынскі веснік. - 2013. - 10 жніўня. - С. 4, 8-9.

О достижениях Кобрина в Год качества.

**Перечень** населенных пунктов, расположенных в пограничной зоне // Народная газета. - 2009. - 6 лютага. - С. 6.

**Кобринщина** в цифрах // Кобрынскі веснік. - 2007. – 1 жніўня. - С. 2.

**Корыстина, В**. Малой родины частичка биографии (2003-2006) / В. Корыстина // Кобрынскі веснік. - 2007. - 13 студзеня. - С. 2.

Развитие Кобринщины за 4 года – от выборов до выборов.

**Волкович, А.** По земле кобринской туристическими маршрутами / А. Волкович // Брестский курьер. – 2005. - № 11. – С. 27.

**Здесь** история реликвии хранит // Заря. – 2005. – 27 декабря. – С. 3.

Достопримечательности, туристические маршруты Кобринского района.

**История** с географией // Брестский курьер. – 2005. - № 34. - С. 2.

**Кобринщина** – наш общий дом // Кобрынскі веснік. – 2005. – 16 красавіка. – С. 3-6.

**Хильчук, М.** Откроем себе настоящую Кобринщину…/ М. Хильчук // Кобрынскі веснік. – 2005. – 16 сакавіка. – С. 5.

Вышел в свет справочник «Туристические маршруты «По земле кобринской».

**Сіневіч, К**. Час надзей і стварэння / К. Сіневіч // Кобрынскі веснік. – 2005. – 15 студзеня. – С. 1-2.

Да 65-годдзя з дня ўтварэння Кобрынскага раёна.

**Мельник, Р.** Кобринщина: вехи поступательного развития / Роман Мельник // Кобрынскі веснік. – 2004. – 22 верасня. – С. 2.

**Региональные** новости: Кобринский район // Заря. – 2003. – 2 августа. – С. 2.

**Земли** полесской милый уголок // Белорусская нива. – 2003. – 27 февраля. – С. 2.

О людях Кобринского района и их делах.

**С чего** начинается малая родина? // Заря. – 2003. – 12 апреля. – С. 1.

Объявлен конкурс на лучшие въездные знаки в населенные пункты района.

**Пятроўская, М.** Кніга «Памяць» нашага раёна гатова да выхаду ў свет / Марыя Пятроўская // Кобрынскі веснік. – 2002. – 21 верасня. – С. 3.

**Хільчук, М.** Гартаючы кнігу «Памяць» / Марыя Хільчук // Кобрынскі веснік. – 2002. – 28 снежня. – С. 6.

**Хільчук, М.** У ёй наша боль і наша радасць / Марыя Хільчук // Кобрынскі веснік. – 2002. – 4 снежня. - С. 1.

Аб прэзентацыі кнігі «Памяць. Кобрынскі раён».

**Ашмянцаў, С.** Этапы вялікага шляху / С. Ашмянцаў // Кобрынскі веснік. – 2000. – 12 студзеня. – С. 1.

Кобрынскому раёну – 60 гадоў.

**Ашмянцев, С.** С чем шагаем в XXI век? / С. Ашмянцев // Рэспубліка. – 1999. – 9 лютага. – С. 4.

**Представляем** районы области : знакомьтесь с Кобринским районом // Свободные новости. – 1999. - № 16. – С. 11.

**Наш** раён у 1991 годзе // Кобрынскі веснік. – 1991. – 17 студзеня. – С. 2.

**Брыштэн, А. П.** Ганаруся табой, Кобрыншчына! / А. П. Брыштэн // Камуністычная праца. – 1967. – 21 лютага.

**Квітнеючая** Кобрыншчына // Камуністычная праца. – 1967. – 21 студзеня.

**Кобринский** район [Электронный ресурс] // Кобринский районный исполнительный комитет. – Режим доступа: http://kobrin.brest-region.gov.by. – Дата доступа: 01.11.2019.

**Кобринский** район // Брестская область на карте [Электронный режим]. - Режим доступа: http://brestobl. net/maps/12kobrin/index.html. – Дата доступа: 01.11.2019.

**Кобринский** район [Электронный ресурс] // Прогулки по Беларуси. – Режим доступа: http://inbelarus.info/component/ content/category. – Дата доступа: 01.11.2019.

**Кобрынскі** раён [Электронны рэсурс] // Туристический Кобрин. – Рэжым доступу: http://ikobrin. ru/kobrinraion.php. – Дата доступу: 01.11.2019.

**Кобрынскі** раён [Электронны рэсурс] // Вікіпедыя. Свабодная энцыклапедыя. – Рэжым доступу: http:// be. wikipedia.org/wiki/Кобрынскі_раён. – Дата доступа: 01.11.2019.

# СПІС
# перыядычных выданняў, матэрыялы з якіх уключаны ў паказальнік

Белорусская нива
Брестский курьер
Заря
Камуністычная праца
Кобрин-информ
Кобрынскі веснік
Народная газета
Рэспубліка
Свободные новости

# ЗМЕСТ

**КОБРЫНСКІ РАЁН: ФАКТЫ, ПАДЗЕІ, ЛЮДЗІ** 4
*Геаграфічнае становішча* 4
*Рэльеф* 4
*Глеба* 4
*Кліматычныя ўмовы* 5
*Гідраграфія* 5
*Карысныя выкапні* 5
*Біярэсурсы* 6
*Гісторыя* 6
*Насельніцтва раёна* 12
*Эканамічны патэнцыял раёна* 12
*Сельская гаспадарка* 13
*Транспарт* 13
*Рэлігія* 13
*Турыстычны патэнцыял* 14
*Вядомыя асобы* 14

**КОБРЫНСКІ РАЁН: ХРОНІКА ГІСТОРЫІ Ў ДАТАХ** 19

**СПІС КРЫНІЦ** 30

**СПІС** перыядычных выданняў, матэрыялы з якіх уключаны ў паказальнік 38

Даведачнае выданне

# Малой радзімы часткa біяграфіі

*Інфармацыйна-бібліяграфічны нарыс*
*да 80- годдзя з часу ўтварэння Кобрынскага раёна*
*як адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі*
*ў Брэсцкай вобласці*

Камп'ютарная верстка С. Д. Курачук
Дызайн вокладкі П. С. Грыневіч

Надрукавана на камп'ютарна-выдавецкай сістэме Кобрынскай
цэнтральнай раённай бібліятэкі
вул. Маршала Жукава, 12,
225301, г. Кобрын, Брэсцкая вобласць